плакаты, выпускал школьные стенгазеты. Но песня была на первом месте. По воспоминаниям его сестры Демиденко (Рогович) Л., их семью в поселке знали как поющую. «Мы пели везде. Летом на скамейке возле дома, а то и просто на завалинке. Мальчики (Володя и братья) пели в поле, когда пасли коров. Пели долгими зимними вечерами». И, конечно, без них не обходился ни один школьный концерт, концерт художественной самодеятельности в Паричском районном доме культуры.

После окончания 7 классов, в 1955 году, Владимир Иосифович работал инструктором в местном доме культуры. Сам исполнял белорусские народные песни (кстати, свою первую песню «Пасею гурочкі» он спел еще в двухлетнем возрасте). А самое главное, всегда радовал свою маму, исполняя со сцены ее любимую «І туды гара, і сюды гара».

Коллектив художественной самодеятельности Паричского районного дома культуры в 1955 году принял участие в областном смотре художественной самодеятельности, где Роговича заметил преподаватель Гомельского музыкального училища имени Н.Соколовского А. Лукомский и предложил ему получить специальное музыкальное образование. Владимир сомневался, но его мама, дала свой наказ: учиться дальше, получить образование, чтобы всегда в руках был кусок хлеба. И как же она гордилась им, когда он приезжал выступать вместе с государственной академической хоровой капеллой БССР к нам в Паричи. Паричане бурными аплодисментами приветствовали своего земляка и его маму, которую он торжественно вел на первый ряд зрительного зала. Об этом нам рассказывала жительница Парич Рудницкая Софья Антоновна.

Но в 1955 году слава и признание были еще далеки. В 1959 году Владимир оканчивает музыкальное училище и получает направление для поступления в Белорусскую государственную консерваторию имени А.Луначарского на факультет хорового дирижирования (класс народного артиста БССР Алексея Петровича Когадеева). Во время учебы студент старается применить свои знания на практике. На третьем курсе музыкального училища он создает народный хор в д. Давыдовка Гомельского района. И уже тогда начинает собирать народные песни, занимается оранжировкой, изучает народные традиции. Наверное, когда он видел шумные паричские свадьбы, у него родилась идея описать родную полесскую свадьбу. Он также собирает и редактирует песни традиционных белорусских жанров: волочобные, купальские, песни, которые исполняют во время зажинок первого снопа и после окончания жатвы.

В Паричах чтили и чтят традиции предков. Шумно отмечают колядки (шчадроўку). Я полагаю, что, будучи ребенком, Владимир Иосифович не раз ходил в «шчодрыкі» и желал хозяевам народной песней добра и богатства, здоровья и хорошего урожая.

С детства В. Роговичу было интересно принимать участие в празднике Купалье, который стал брэндом нашего поселка и до сих пор является любимым праздником паричан. Возможно, эти детские впечатления подтолкнули Владимира Иосифовича к купальской тематике.

Шли годы. В 1964 году В. Рогович заканчивает Белорусскую государственную консерваторию. Как вспоминала его сестра Демиденко Л. (Рогович), присутствовавшая на дипломном концерте брата, достаточно было одного взмаха дирижерской палочки, как многие обратили внимание на выпускника. Г. Ширма, руководитель Государственной академической хоровой капеллы, сразу обратил на него внимание и пригласил на должность дирижера – хормейстера в свой коллектив. Для выходца из полесской глубинки выпал удивительный шанс работать с таким талантливым человеком, учиться у него дирижерскому мастерству, организационной работе и отношению к людям. Г.Р.Ширма закрепил в нем любовь к народной музыке, привил стремление собирать песенное белорусское наследие.

В 1970 году встал вопрос, кто будет преемником Г. Ширмы, выбор пал на В. Роговича. В течение 12 лет (время, когда он был главным дирижёром) капелла несколько раз выступала в его родном поселке Паричи. Для паричан это было грандиозным событием. Жители просили спеть и самого Владимира Иосифовича. И, конечно же, звучала его любимая песня «Пасею агурочкі», «Ой, Жураўка, жураўко». Их до сих пор, как память о земляке, исполняет коллектив Паричского ГДК народный ансамбль народной музыки «Натхненне» (художественный руководитель Хоронеко А.). Земляки были горды, когда в 1977 году на Всесоюзном конкурсе профессиональных хоровых коллективов хоровая капелла впервые завоевала звание «Лауреата» и заняла второе место. Особенно нравились паричанам песни в исполнении капеллы, аранжировку и обработку которых делал сам Рогович. Это « Ой сівы конь бяжыць», «Із далёкіх із краёў», «Мікіта», «Камары гудзяць», «Ой на Купалле, на Яна».

В 80-е годы у Владимира Иосифовича начался новый этап и в жизни, и в творчестве. Он начинает заниматься сбором белорусских народных песен. Приезжал он и на свою малую родину. Записывал песни окрестных деревень. Сотрудничал с самодеятельными коллективами деревень Ковчицы-1, Ковчицы-2 Светлогорского района. Некоторые из них вошли в сборник «Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць». (1989 г.).

Для многих земляков стало открытием, что Владимир Иосифович в 1998 году создал профессиональный мужской вокальный октет, с которым он дал сотни концертов и записал 4 диска, которые были изданы в Германии. Гастроли в Германии стали последним турне в его жизни.

Похоронен Владимир Иосифович на своей малой родине в г.п. Паричи Светлогорского района Гомельской области. Родная земля давала ему силы и вдохновение, здесь он обрел и вечный покой. В таких поселках, как наши Паричи, особенно чтят и помнят тех, кто прославил его, кто впитал сам музыку своей малой родины, пропагандировал ее; не терял связи с земляками. В школе, в городской библиотеке проходят вечера памяти В. Роговича. Земляки гордились и гордятся своим земляком.

***Вячаслаў Красулін***

## АБЫХОДНЫЯ ПЕСНІ Ў ЗБОРНІКУ УЛАДЗІМІРА РАГОВІЧА «ВЯНОК БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ»

*Аўтар артыкула аналізуе песні калядных і веснавых абыходаў, змешчаныя ў вельмі папулярнай напрыканцы XX стагоддзя ў асяродку знаўцаў і аматараў песеннага фальклору Беларусі кнізе Уладзіміра Раговіча «Вянок беларускіх народных песень».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Viachaslau Krasulin***

**ROUND SONGS IN THE BOOK «THE GARLAND OF BELARUSIAN FOLK SONGS» COLLECTED BY ULADZIMIR RAHOVICH**

*The author analyzes the songs of Christmas and spring round from the very popular in the late 20th century among lovers of folk songs of Belarus book «The Garland of Belarusian Folk Songs» collected by Uladzimir Rahovich.*

Адна з найбольш дасведчаных у творчасці і жыццёвых шляхах У. Раговіча даследчыца Н. Мазыурына адзначае: «У 1982–87 гады Уладзімір Іосіфавіч – старшы выкладчык і загадчык кафедры харавога дырыжыравання Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. Горкага… У гэтыя ж гады ішла натхнёная праца над “Вянком беларускіх народных песень”, у які ўвайшлі лепшыя ўзоры народнапесеннага мастацтва запісу У. Раговіча. Зборнік склалі амаль усе жанравыя, стылявыя і структурныя разнавіднасці традыцыйных і сучасных песень, што з’яўляюцца класічнай спадчынай беларусаў. За мастацкае афармленне, зробленае выдатным графікам Уладзімірам Вішнеўскім, кніга атрымала вышэйшыя ўзнагароды на некалькіх кніжных выставах» [3]. Зборнік сапраўды мае выключную паліграфію, вельмі густоўнае мастацкае аздабленне (мал. 1) і цікавы змест.

Як і яго настаўнік (перадусім па эстэтыцы працы з фальклорам і па светапогляднай аснове стаўлення да беларускай песні) Рыгор Шырма, У. Раговіч меў выключную музычную памяць, абсалютны слых. Многія фальклярысты незадаволеныя адсутнасцю разгорнутай мелізматыкі, падрабязна выпісанай варыятыўнасці ў расшыфроўках У. Раговіча. Мне ж гэта нагадвае зборнікі Р. Шырмы, дзе структурная аснова аснова (пульсуючы «рыф») тыпавога напеву пазбаўлены другасных, не зусім вартых увагі дэталяў. Р. Шырма, па звестках сучаснікаў, амаль не карыстаўся гуказапісвальнай апаратурай у экспедыцыях, ён заўсёды мог па памяці аднавіць аднойчы пачуты напеў і тэкст да яго.

У. Раговіч добра валодаў гуказапісвальнай тэхнікай, шмат працаваў з аўдыяархівамі, рабіў экспедыцыйныя аўдыязапісы (мал. 2), што, аднак, не адвабілівала яго ад інтуітыўнага адчування першаасновы кожнага песеннага ўзору, які прывабліваў яго ўвагу. Густ пры выбары матэрыялу яго не падводзіў. У экспедыцыях арыентаваўся на выбітных, генетычна геніяльных носьбітаў, накшталт Марыі Зуевай з вёскі Стаўбун (мал. 2), якая цягам усяго жыцця была адданай захавальніцай і выканаўцай вельмі вядомых абыходных і карагодных веснавых песень Падняпроўя – песень «Стралы». Большасць людзей, якія яе ведалі (ад расійскіх, украінскіх і беларускіх масцітых фальклярыстаў да стракатай постфальклорнай моладзі, тыднямі бываўшай у яе ў гасцях), пяшчотна і паважліва звалі М. Зуеву «Лаўрэнцьеўна», паколькі больш блізкага, адкрытага, шчырага, добразычлівага і тактоўнага чалавека была цяжка ўявіць. Яе мастацтва, зафіксаванае на аўдыёстужках кружэлак фірмы «Мелодыя», на плёнках шматлікіх фальклорных архіваў, мела абсалютна жывую і гнуткую прыроду. Нездарма да яе заўсёды хіліліся найбольш адораныя спявачкі-пераемніцы фальклорных узораў, шмат з якімі яна дзялілася сваімі спеўнымі навыкамі, светапоглядам і дысцыплінай у адносінах да песеннай традыцыі, носьбітам якой была і якую вельмі паважала. Ужо ў XXI стагоддзі, вітаючы моладзь, якая імкнулася авалодаць рэпертуарам і манерай выканання абыходных песень «Стралы», яна з’яўлялася своеасаблівым прыкладам настаўніка музыкі вуснай традыцыі для такіх адораных спявачак, як Т. Пладунова (мал. 3), чыя аўдыторыя не была абмежавана сценамі, бо гэтыя песні скіраваны Сусвету: зямлі, далягляду, нябёсам, нашчадкам. М. Зуева гэта добра разумела і, што важна, магла давесці сваім слухачам і вучням з неабмежаванай раскладам і нарматывамі «фальклорнай акадэміі», што перыядычна ўзнікала на абрадзе «Страла».




Малюнак 1 – У. Вішнеўскі, Вокладка «Вянка…», 1988



Малюнак 2 – У. Раговіч запісвае песні «Стралы», справа – Марыя Зуева (‘Лаўрэнцьеўна’). Стаўбун, 1980-я



Малюнак 3 – Т. Пладунова (пасярэдзіне) з М. Зуевай (справа) на «Страле». Стаўбун, 2010

Зносіны з такога ўзроўню выканаўцамі, якіх у 1980-я гады ў Беларусі было яшчэ шмат, дазвалялі У. Раговічу плённа і змястоўна працаваць з фальклорам: «Вынікам шматгадовай працы збіральніка-фальклярыста і харавога дырыжора, рэзультатам сістэмнага аналізу тысяч уласных ды іншых запісаў беларускіх народных песень, рускага і ўкраінскага песеннага фальклору стала стварэнне У. Раговічам сучаснай навукова-метадычнай канцэпцыі — унікальнай сістэмы натацыі народных песень на аснове **адзінства рытмікі верша і напеву**. Яна зыходзіць з непарыўнасці верша- і меластварэння ў народнай песні, з лінеарнасці развіцця напеву ў часавай прасторы і псіха-фізіялагічных асаблівасцяў чалавека падчас спеваў. Менавіта пачынаючы з “Вянка беларускіх народных песень” усе песні Уладзімір Іосіфавіч нацыруе ў згодзе з прынцыпам адзінства рытмікі верша і напеву. Дарэчы, гэты самы прынцып ляжыць і ў аснове запісу старажытных царкоўнаславянскіх песнапенняў. Ён захаваны У. Раговічам і пры стварэнні аранжыровак культавых і аўтарскіх твораў» [3].

Значную частку песень вянка складаюць каляндарна-абрадавыя песні, сярод якіх шмат калядных абыходных песень (мал. 4). Палеская традыцыя калядавання, як вядома, непарыўна звязана з абыходамі вёскі гуртом калядоўшчыкаў, спевамі калядак пад вокнамі і ў хатах аднавяскоўцаў. У. Раговіч, якому палеская спеўная культура была асабліва блізкая, змясціў у сваім «Вянку…» амаль два дзясяткі калядных песень пераважна абыходнай функцыянальнасці. Ад «Паехала Каляда з канца ў канец» (№ 1) [2, с. 22] да «Ой, у полі, полі стаяла бяроза» (№ 19) [2, с. 42]. Кожная з іх – прыклад рытмічнай тыпавой варыятыўнасці і арыгінальнага меладычнага малюнка (мал. 4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




Малюнак 4 – «Ой, свят вечар, свят», абыходная калядная з «Вянка…» [2 с. 39]




Малюнак 5 – «Песенька мая харошая», абыходная песня «Стралы» з «Вянка…» [2, с. 45]

Адбор абыходный прыкладаў у «Вянок…» быў не праізвольным, што не дзіўна, калі ўлічыць «стрыжнёвасць» каляндарных напеваў у песеннай сістэме беларусаў [1]. Справа ў тым, што, як адзначае Н. Мазурына: «У. Раговіч прыйшоў да высновы, што для запісу народнай вакальнай музыкі нельга карыстацца еўрапейскай сістэмай натацыі кампазітарскай музыкі, дзе фіксацыя метра-рытмікі заснавана на чаргаванні моцных і слабых доляў. Народная песня валодае сваёй логікай развіцця, напружанняў і спадаў, што і павінна быць адлюстравана пры запісе. Вынаходніцтва У. Раговічам тактаметрычнай сістэмы запісу народных песень на аснове адзінства рытмікі верша і напеву адкрывае новыя і вельмі цікавыя заканамернасці арганізацыі традыцыйнага беларускага народнага меласу, дазваляе ўбачыць цікавыя перспектывы развіцця айчыннай фалькларыстыкі» [3].

Праз масленічныя рытмічныя папеўкі «А ў нас сёння Масленка, Масленка» (№ 20) [2, с. 43], пабудаваныя на жорсткай рытмаформуле «проса» і архаічным ангемітонным ладзе, праз медытатыўную загукальна-веснавую «Гэй, вясна!» (№ 21) [2, с. 44] У. Раговіч вядзе чытачоў «Вянка…» да знакавай стрэльнай песні «Песенька мая харошая» (№ 22) [2, с. 45], рытмічныя і меладычныя структуры якой сваёй гнуткасцю і палімернасцю нібыта дашчэнту запаўняюць шматузроўневую адкрытую прастору і паветра, на пленэры якіх песня дагэтуль (дзякуючы носьбітам з гурта «Стаўбунскія вячоркі» і маладым пераемнікам) штогод гучыць у тэрмін веснавога навалуння ў Стаўбуне дагэтуль.

Падбор абыходных песень у «Вянку» сведчыць пра тое, што падыход У. Раговіча да беларускай песні дагэтуль яшчэ не асэнсаваны цалкам. Магчыма, яго пераасэнсаванне – наперадзе, паколькі: «Абапіраючыся на агульнапрынятую ў еўрапейскай музычнай сістэме, збіральнік распрацаваў музычную метранамічную тэрміналогію на беларускай мове, якая была выкарыстана Уладзімірам Іосіфавічам ва ўсіх яго выданнях беларускага песеннага фальклору» [3]. Але гэтае параасэнсаванне мае на ўвазе настолькі ж глыбокае разуменне прыроды песеннай сістэмы беларусаў, наколькі яно была ўласціва У. Раговічу.

**Спіс літаратуры:**


1. Можейко, З. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт систем.-типол. исслед / Зинаида Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
2. Раговіч, У. Вянок беларускіх народных песень / Уладзімір Раговіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 431 с.
3. Мазурына, Н. Біяграфія Уладзіміра Іосіфавіча Раговіча / Наталля Мазурына // Parichi.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.parichi.by/articles/3/6/. – Дата доступу: 24.03.2018.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ